УДК 004.9:378:81.243:35.08

**S. LAPINA,**
Head of the Department of Public Administration in Social Sphere and Belarus Studies of the Academy of Public Administration under the aegis of the President of the Republic of Belarus

**I. BUDKO,**
Head of the Department of Belarusian and Russian Languages of Belarusian National Technical University

**I. KAPYLOU,**
Acting Director of the °Ya. Kolas Institute of Linguistics of the Center for Belarusian Culture, Language and Literature Research of the National Academy of Sciences of Belarus

**I. DOMASEVICH,**
Lecturer at the Department of Public Administration in Social Sphere and Belarus Studies of the Academy of Public Administration under the aegis of the President of the Republic of Belarus

COMPUTER TECHNOLOGIES IN THE LANGUAGE TRAINING OF THE SPECIALISTS IN THE FIELD OF PUBLIC ADMINISTRATION

**С. В. ЛАПІНА,**
загадчык кафедры дзяржаўнага кіравання сацыяльнай сферай і беларусазнаўства Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь, доктар сацыялагічных навук, прафесар

**І. У. БУДЗЬКО,**
загадчык кафедры беларускай і рускай моў Беларускага нацыянальнага тэхнічнага ўніверсітэта, кандыдат філалагічных навук, дацэнт

**І. Л. КАПЫЛОЎ,**
В. а. дырэктара Інстытута мовазнаўства імя Якуба Коласа Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, кандыдат філалагічных навук, дацэнт

**І. У. ДАМАСЕВІЧ,**
выкладчык кафедры дзяржаўнага кіравання сацыяльнай сферай і беларусазнаўства Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь

КОМПЬЮТЕРНЫЕ ТЕХНОЛОГИИ В ЯЗЫКОВОЙ ПОДГОТОВКЕ СПЕЦИАЛИСТОВ В СФЕРЕ ГОСУДАРСТВЕННОГО УПРАВЛЕНИЯ

# КАМП'ЮТАРНЫЯ ТЭХНАЛОГІІ Ў МОЎНАЙ ПАДРЫХТОЎЦЫ СПЕЦЫЯЛІСТАЎ У СФЕРЫ ДЗЯРЖАЎНАГА КІРАВАННЯ

*Апісаны вынікі выканання праекта па стварэнні інавацыйнага электроннага вучэбна-метадычнага комплексу (ЭВМК) па дысцыпліне «Беларуская мова: прафесійная лексіка» для студэнтаў спецыяльнасці «Дзяржаўнае кіраванне і эканоміка». ЭВМК дапаможа вырашыць шэраг выхаваўча-адукацыйных задач у працэсе моўнай падрыхтоўкі спецыялістаў у сферы дзяржаўнага кіравання: у кароткі час дапаможа студэнтам засвоіць сістэму неабходных ведаў па дысцыпліне, будзе садзейнічаць фарміраванню ў іх належнага ўзроўню моўнай кампетэнцыі ва ўмовах дзяржаўнага білінгвізму і дазволіць павысіць узровень самаадукацыі.*

*Ключавыя словы: інтэрактыўнасць, інфармацыйныя тэхналогіі, камунікатыўная кампетэнтнасць, лінгвадыдактыка, лінгвістычная падрыхтоўка, міждысцыплінарныя сувязі, мультымедыйнасць, электронны вучэбна-метадычны комплекс.*

*Описаны результаты выполнения проекта по созданию инновационного электронного учебно-методического комплекса (ЭУМК) по дисциплине «Белорусский язык: профессиональная лексика» для студентов специальности «Государственное управление и экономика». ЭУМК поможет решить ряд воспитательно-образовательных задач в процессе языковой подготовки специалистов в сфере государственного управления: в краткие сроки поможет студентам усвоить систему необходимых знаний по дисциплине, будет способствовать формированию у них надлежащего уровня языковой компетенции в условиях государственного билингвизма и позволит повысить уровень самообразования.*

*Ключевые слова: интерактивность, информационные технологии, коммуникативная компетентность, лингводидактика, лингвистическая подготовка, междисциплинарные связи, мультимедийность, электронный учебно-методический комплекс.*

*The article gives the results of the project on the creation of an innovative electronic educational and methodical complex (EEMK) on the subject "the Belarusian language: professional language" for students majoring in "Public Administration and Economics". EEMC helps to solve several educational tasks in the process of language training of specialists in the field of public administration: in the short term it will give*

*students necessary knowledge on the discipline, develop an adequate level of linguistic competence in terms of bilingualism and increase their level of self-education.*

*Key words: interactivity, information technologies, communicative competence, didactics, language skills, interdisciplinary connections, multimedia, electronic educational-methodical complex.*

Падрыхтоўка спецыялістаў вышэйшай кваліфікацыі ў галіне дзяржаўнага кіравання, як і кадраў для сацыяльнай сферы і гаспадарчай дзейнасці ўвогуле, сёння немагчымы без камп'ютарных адукацыйных тэхналогій. Распрацоўка электронных вучэбна-метадычных комплексаў (далей – ЭВМК) з'яўляецца прыярытэтным напрамкам сучаснай сістэмы адукацыі. Укараненне інфармацыйных тэхналогій у вучэбны працэс дазваляе павысіць якасць навучання будучых спецыялістаў, аптымізаваць сам навучальны працэс і ў кароткія тэрміны дасягнуць эфектыўных вынікаў.

Мультымедыйныя вучэбныя дапаможнікі з'яўляюцца новым відам сродкаў навучання, якія могуць шырока выкарыстоўвацца як для аўдыторнай адукацыі, так і дыстанцыйнай. Мультымедыйныя навучальныя сістэмы дазваляюць гарманічна аб'ядноўваць лекцыю з дэманстрацыяй вучэбнага матэрыялу, практыкум у выглядзе камп'ютарнага імітатара, тэставую сістэму і ўсе дадатковыя матэрыялы ў адзіным інтэрактыўным камп'ютарным дапаможніку. Інфармацыйныя тэхналогіі даюць магчымасць інтэнсіфікаваць працэс падрыхтоўкі будучых спецыялістаў, а таксама спрыяюць больш поўнаму авалоданню вучэбным матэрыялам у кантэксце міждысцыплінарных сувязей.

Стварэнне новага тыпу дапаможніка дазваляе вырашаць адразу некалькі дыдактычных задач: актуалізаваць і пашырыць ужо атрыманыя веды, засвоіць новы тэарэтычны матэрыял у інавацыйнай дыялогавай форме, актыўна ўключаць у навучальны працэс аўдыя- і відэаматэрыял з мэтай паспяховага засваення атрыманай інфармацыі, зрабіць больш эфектыўнай і разнастайнай сістэму самакантролю і кантролю засвоеных ведаў з боку выкладчыкаў, развіваць творчыя навыкі ў будучых кіраўнікоў, актывізаваць самастойную працу студэнтаў, што ў сённяшніх умовах развіцця вышэйшай школы становіцца стратэгічна важнай задачай.

Для паспяховага дзяржаўнага будаўніцтва ў Беларусі неабходнай умовай з'яўляецца высакаякасная моўная адукацыя кіруючых кадраў. У адпаведнасці з арт. 26 Закона Рэспублікі Беларусь «Аб дзяржаўнай службе ў Рэспубліцы Беларусь», валоданне дзяржаўнымі мовамі Рэспублікі Беларусь з'яўляецца адным з кваліфікацыйных патрабаванняў да асоб, якія паступаюць на дзяржаўную службу. Эфектыўнасць лінгвістычнай адукацыі студэнтаў нефілалагічных спецыяльнасцей шмат у чым залежыць ад якасці і прэзентабельнасці матэрыялу, якім неабходна авалодаць будучым кіраўнікам. Укараненне інфармацыйных тэхналогій у дыдактычны працэс дазволіць значна павысіць яго якасць, ператварыць студэнта з пасіўнага ўдзельніка адукацыйнага працэсу ў актыўнага, стымуляваць у яго творчы падыход да засваення навучальных дысцыплін, індывідуалізаваць вучэбны працэс. Мультымедыйныя навучальныя сродкі садзейнічаюць спалучэнню розных спосабаў засваення новай інфармацыі.

ЭВМК новага тыпу як сукупнасць тэарэтычнага і практычнага вучэбнага матэрыялу праграмнага забеспячэння мультымедыйнай інфармацыяй дапамагае вырашыць некалькі выхаваўча-адукацыйных задач: у кароткі час даць студэнтам сістэму неабходных ведаў па канкрэтнай дысцыпліне, сфарміраваць у іх неабходны ўзровень моўнай кампетэнцыі, павысіць узровень самаадукацыі, кантролю і самакантролю ведаў.

Галоўным дасягненнем электроннага адукацыйнага рэсурсу з'яўляецца магчымасць спалучаць выкладанне матэрыялу дысцыпліны з заданнямі, арыентаванымі на яго замацаванне. Электронны адукацыйны рэсурс, створаны з выкарыстаннем сучасных мультымедыйных і інтэрактыўных элементаў, дазваляе перайсці на якасна новы ўзровень моўнага навучання.

Выкладчыкамі Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь сумесна з выкладчыкамі філалагічных кафедраў негуманітарных вышэйшых навучальных устаноў і спецыялістамі Інстытута мовазнаўства імя Якуба Коласа Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры Нацыянальнай Акадэміі навук Беларусі створаны ЭВМК па дысцыпліне «Беларуская мова: прафесійная лексіка».

ЭВМК адпавядае наступным характарыстыкам:

• мае стапрацэнтную мультымедыйнасць, якая забяспечвае нагляднасць, вобразнасць і шырыню інфармацыйнай плыні;

• забяспечвае эфектыўнасць успрыняцця інфармацыі;

• характарызуецца насычанай інтэрактыўнасцю;

• уключае разнастайныя кантрольныя і тэставыя заданні, якія забяспечваюць індывідуалізацыю і актыўнасць засваення матэрыялу;

• уключае вялікі аб'ём мультымедыйнага вучэбнага матэрыялу, які, дзякуючы нагляднасці і вобразнасці, лёгка засвойваецца;

• змяшчае спасылкі на даведачную інфармацыю ў сетцы Інтэрнэт;

• дае магчымасць работы з усімі сучаснымі мабільнымі прыстасаваннямі.

Структуру ЭВМК складаюць наступныя элементы: метадычныя ўказанні для выкладчыкаў і студэнтаў па выкарыстанні комплексу; вучэбная праграма па дадзенай дысцыпліне; тэарэтычная частка (у выглядзе пытанняў і адказаў); ілюстрацыйны матэрыял (прэзентацыі, аўдыя-, відэазапісы, анімацыі і г. д.); тэсты для самакантролю; практычная частка (збор заданняў,

практыкаванняў, тэсты з аўтаматызаванай сістэмай іх праверкі і інш.); рэкамендаваная літаратура.

Лекцыйны блок уключае восем лекцый (мал. 1) па асноўных тэарэтычных пытаннях беларускага мовазнаўства: мова і грамадства, гістарычныя этапы развіцця беларускай мовы; лексіка, лексікалогія, фразеалогія; функцыянальныя стылі беларускай мовы; тэрміны і спецыфіка беларускай навуковай тэрміналогіі; культура мовы.

У якасці дадатку да лекцыйнага курса створана мультымедыйная прэзентацыя па гістарычным старабеларускім пісьменстве: фотаздымкі старабеларускіх рукапісаў, скарынаўскіх выданняў, Евангелля Васіля Цяпінскага, Аршанскае Евангелле, Полацкае Евангелле, Статут 1588 года, Катэхізіс Сымона Буднага, Радзівілаўскі летапіс і інш. Гэта дазваляе ў візуальна даступнай форме дэталёва і падрабязна прадставіць складаны для ўспрыняцця сучаснымі навучэнцамі матэрыял. Уключэнне дадзенага матэрыялу ў працэс навучання будзе садзейнічаць таксама патрыятычнаму выхаванню будучых кіраўнікоў. Пры стварэнні прэзентацыі былі выкарыстаны элементы анімацыі і відэаўстаўкі. Агульным вынікам уключэння ў склад лекцыйнага курса мультымедыйных складнікаў з'яўляецца павышэнне эфектыўнасці інфармацыйнага матэрыялу і, як вынік гэтага, – паляпшэнне якасці ведаў і хуткасці іх засваення.

Практычны модуль складаецца з тэставых заданняў, заданняў для самакантролю і кантролю з боку выкладчыка; узораў афармлення дзелавых папер па-беларуску, а таксама ўзораў беларускамоўных аўдыядыялогаў з афіцыйнай сферы дзейнасці, якія выкарыстоўваюцца з мэтай выпрацоўкі навыкаў вуснага маўлення на беларускай мове ў прафесійнай дзейнасці будучых кіраўнікоў. Пры распрацоўцы блока практычных заданняў аўтарскі калектыў засяроджваў увагу не толькі на засваенні правіл арфаграфіі і пунктуацыі (асобныя раздзелы ўведзены ў склад ЭВМК). У першую чаргу ўвага была скіравана на фарміраванне ў будучых кіраўнікоў камунікатыўных навыкаў маўлення па-беларуску.

Створаны корпус заданняў, арыентаваных на ўдасканаленне маўлення па-беларуску ў дзелавой сферы камунікацыі. Заданні ўключаюць наступнае: пастаноўку праблемных пытанняў з мэтай іх далейшага разгортвання ў дыскусію; ролевыя гульні; аналіз тэкстаў праблемнага характару і на іх аснове прадуцыраванне самастойных маналагічных выказванняў.

Адабраны корпус тэкстаў для аналізу і перакладу. Тэксты ахопліваюць шырокае тэматычнае поле: «Чалавек, грамадства, дзяржава», «Як стаць лідарам», «Як навучыцца кіраваць сваім настроем», «Гісторыя стварэння, міжнароднае значэнне Міжнароднага валютнага фонду і Міжнароднага банка рэканструкцыі і развіцця» і інш.

Інтэрфейс старонкі з адпаведнымі заданнямі мае наступны выгляд (гл. мал. 2).

Падрыхтаваны «Руска-беларускі тлумачальны слоўнік эканамічных тэрмінаў». Рэестр слоўніка ўключае 1400 лексем. Слоўнік змяшчае тлумачэнне актуальных эканамічных тэрмінаадзінак. Акрамя таго, ён мае мэтанакіраванае вучэбна-метадычнае прызначэнне: дапамагчы дасягнуць адназначнага разумення сутнасці сучасных эканамічных паняццяў (мал. 3).

Упершыню ў ЭВМК па дысцыпліне «Беларуская мова: прафесійная лексіка» ўключаны аўдыяматэрыял з узорным беларускім маўленнем, які складаецца з двух блокаў. Першы блок уключае вершы класікаў беларускай літаратуры («Санет» і «Зорка Венера» Максіма Багдановіча, «Родныя вобразы» Якуба Коласа, «Спадчына» Янкі Купалы, «Спелы Бор» Анатоля Вялюгіна, «На Беларусі Бог жыве» Уладзіміра Караткевіча і інш.) у акцёрскім выкананні. Другі блок змяшчае ўзоры беларускага маўлення вядомых дзеячаў беларускай культуры (Якуб Колас, Іван Шамякін, Іван Навуменка, Мікола Мятліцкі, Яўгенія Янішчыц, Мікалай Вінярскі і інш.). Прызначэнне дадзеных аўдыяблокаў заключаецца ў фарміраванні ў навучэнцаў навыкаў вуснага маўлення ў прафесійнай сферы і засваенні асноўных арфаэпічных норм беларускай літаратурнай мовы. Адпаведнае напаўненне старонкі адлюстроўвае мал. 4.




**Мал. 1.** Інтэрфейс старонкі з лекцыйным курсам




**Мал. 2.** Інтэрфейс старонкі з практычнымі заданнямі




**Мал. 3.** Інтэрфейс старонкі з руска-беларускім тлумачальным слоўнікам эканамічных тэрмінаў




**Мал. 4.** Інтэрфейс старонкі з узорамі беларускага маўлення

Распрацаваны ўзорныя мадэлі дзелавых папер на беларускай мове (мал. 5): заява, аўтабіяграфія, хадайніцтва, рэзюмэ, дагавор, даручэнне, дакладная запіска, загад, накіраванне, паведамленне, пратакол і інш. Дадзена кароткае апісанне, класіфікацыя дзелавых папер (распарадчыя, выканаўчыя, дакументы ўліковага афармлення (ведамасці размеркавання розных выдаткаў, ведамасці налічэння амартызацыі), камбінаваныя дакументы (расходны касавы ордар, авансавая справаздача і інш.)), дэталёва прааналізаваны рэквізіты (аўтар дакумента, адрас арганізацыі, дата дакумента, адрасаванне дакументаў, адрасат і інш.).

Электронны прадукт будзе працаваць у браўзеры з падтрымкай стандарту HTML5 без прывязкі выключна да аперацыйнай сістэмы Windows, што дазволіць значна пашырыць кола будучых карыстальнікаў, паколькі выкарыстанне сучасных браўзераў значна паскорыць і палегчыць капіраванне і функцыянаванне прадукта (напрыклад, на планшэтах). ЭВМК будзе працаваць без залежнасці ад Інтэрнэта на большасці распаўсюджаных і папулярных аперацыйных сістэм. Першы (адміністрацыйны) модуль будзе ўтрымліваць праграмы для стварэння статычных HTML-файлаў і Javascript-файлаў. Адміністрацыйны модуль будзе ствараць гэтыя файлы з файлаў-звестак і шаблонаў вонкавага выгляду.

Вызначаны бібліятэкі для афармлення HTML-старонак: Bootstrap і jQuery, што дазволіць стварыць добры выгляд сайта на розных прыладах – ад вялікіх манітораў да маленькіх планшэтаў. Стыльны выгляд будзе адпавядаць густам моладзевай аўдыторыі. Маніторынг інтэрфейсаў электронных прадуктаў, прысвечаных беларускай мове, беларускай культуры і літаратуры, паказаў, што распаўсюджанае ў апошнія дзесяцігоддзі імкненне да стылёвай архаізацыі і вельмі актыўнае выкарыстоўванне элементаў сярэднявечнай культуры (старажытнай паперы, відаў старадрукаў, старажытнай зброі, прадметаў побыту і г. д.) сёння страцілі сваю актуальнасць. Таму электронны прадукт створаны з улікам сучасных тэндэнцый і будзе адпавядаць патрабаванням лаканічнасці і мінімалізму (мал. 6).




**Мал. 5.** Інтэрфейс старонкі з узорамі дзелавых папер па-беларуску




**Мал. 6.** Выгляд галоўнай старонкі ЭВМК

Улічваючы сучасны ўзровень развіцця інфармацыйных тэхналогій, плануемы вучэбна-метадычны комплекс стане не толькі электронным адукацыйным рэсурсам, але і вучэбна-метадычным комплексам новага пакалення, які можа быць рэалізаваны ў розных праграмах, што інтэгравана і ўзаемазвязана выкарыстоўваюцца ў вучэбным працэсе: DVD-ROM – версія для самастойнай работы ў аўтаномным рэжыме за камп'ютарам; СЕТКАВАЯ-версія для калектыўнага навучання ў лакальнай сетцы ВНУ; SCORM-версія для арганізацыі дыстанцыйнага навучання ў LMS-асяроддзі; ON-LINE-версія, калі тэмы заняткаў транслююцца з аддаленага сервера; MOBIL-версія, калі навучанне ажыццяўляецца з дапамогай КПК або смартфонаў; КНІЖНАЯ-версія – «цвёрдая копія» – канспект лекцый. У вучэбна-метадычным комплексе будуць рэалізаваны вядомыя педагагічныя методыкі навучання. У адпаведнасці са структурай вучэбна-метадычнага комплексу вылучаюцца тры віды адукацыйных элементаў: лекцыя, практыкум і атэстацыя. Электронны рэсурс можа ўключаць як усе тры віды адукацыйных кампанентаў, так і пакрываць толькі адзін з іх: электронны падручнік, практычны модуль або трэнінг, атэстацыйны блок. Распрацаванае навукова-метадычнае забеспячэнне і рэкамендацыі паслужаць асновай для ўдасканалення якасці прафесійнай падрыхтоўкі будучых кіраўнікоў, а матэрыялы даследавання будуць мець шырокае выкарыстанне ў выкладчыцкай практыцы пры падрыхтоўцы будучых спецыялістаў.

Такім чынам, увядзенне дадзенага мультымедыйнага ЭВМК у вучэбны працэс дазволіць павысіць моўную кампетэнцыю студэнтаў і асоб, якія праходзяць перападрыхтоўку і павышэнне кваліфікацыі ў галіне дзяржаўнага кіравання, узровень валодання імі вусным маўленнем у прафесійнай сферы камунікацыі, пашырыць іх прафесійны слоўнікавы запас (як на рускай, так і на беларускай мовах), будзе спрыяць выхаванню моўнай культуры будучых кіраўнікоў, што набывае асаблівую актуальнасць ва ўмовах дзяржаўнага білінгвізму.

*Дата паступлення артыкула ў рэдакцыю: 03.12.2015.*